шараговых настаўнікаў і навукоўцаў, апантаных звышкаштоўнымі ідэямі...» [3]. Герой апавядання Павел Дук падаецца жывым чалавекам са сваімі праблемамі і памылкамі, яму нельга не суперажываць. Згодна са словамі А. Івашчанкі, «і ўсё ж сярод вышэйшых вартасцяў празаіка – уменне перадаць пачуццё (як вядома, з узростам свежасць пачуццяў прытупляецца), прымусіць пражыць частку жыцця разам з героямі. Чытаючы апавяданне “Мільярд удараў”, напраўду адчуў клаўстрафабічную жуду. Цяпер ліфтамі стараюся не карыстацца» [4, с. 161].

Такім чынам, праявы экзістэнцыйнага страху ў апавяданні «Мільярд удараў» Ю. Станкевіча цалкам адпавядаюць апісанню Ю. Шчарбатых. Адметнасцю ўвасаблення гэтага страху была спроба пісьменніка перадаць псіхалогію героя, уласцівую яму боязь абмежавання свабоды, што наўпрост звязана з клаўстрафобіяй, за якой тояцца страхі аб сэнсе жыцця. Іншымі словамі, аўтар адлюстроўвае непарыўную сувязь паміж біялагічным і экзістэнцыйным страхам. Ю. Станкевіч падае несуцяшальнае вырашэнне ўнутранага канфлікту персанажа, якое прыводзіць да яго смерці, што ў спалучэнні з ідэяй выключнай ролі выпадку, збегу абставін у жыцці чалавека надае апавяданню мастацкую пераканаўчасць. Эмацыйны стан героя – надзвычай важны для Ю. Станкевіча. Паглыбленне ва ўнутраны свет, душэўныя зрухі становяцца для яго адным з найбольш яркіх сродкаў стварэння мастацкага вобраза. Уся жудасць перадаецца ў яго настроі, думках і паводзінах персанажа, што выразна адлюстроўвае яго эмацыйны стан і характар.

**Літаратура**

1 Станкевіч, Ю. Мільярд удараў / Ю. Станкевіч. – Мінск: Галіяфы, 2008. –320 с.

2 Риман, Ф. Основные формы страха / Ф. Риман. – Москва: Алетейа, 1999. – 287 с.

3 Туровіч, Г. Збіральнік жахаў [Электронны рэсурс] / Г. Туровіч. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Hienadz_Turovic/Zbiralnik_zachau.html. – Дата доступу: 20.04.2019.

4 Івашчанка, І. Мільярд удараў: Размова пра кнігу Юрыя Станкевіча / І. Івашчанка // Дзеяслоў. – 2008. – № 36. – С. 156–169.

**УДК 821.161.3-3*У. Арлоў**

***В. А. Каменюкова***

## АНЕЙРЫЧНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ І МАТЫЎ ДВАЙНІЦТВА Ў КНІЗЕ У. АРЛОВА «ТАНЦЫ НАД ГОРАДАМ»

*У артыкуле разглядаецца спецыфіка рэалізацыі феномена двайніцтва ў кнізе У. Арлова «Танцы над горадам». Робіцца акцэнт на выкарыстанні аўтарам змененых станаў свядомасці, звязаных з анейрычнай рэальнасцю, а таксама з механізмам крэатыўнага акту. Выяўлены асноўныя атрыбуты двухсветавасці ў кнізе: люстраныя адбіткі, незвычайныя сны, – што ўвасабляюць памежны стан галоўных герояў аповесцей. Зроблена выснова аб сітуацыі памежнасці як ключавым тэкстаўтваральным прынцыпе твораў зборніка «Танцы над горадам».*

Кніга Уладзіміра Арлова «Танцы над горадам», за якую пісьменнік у 2018 годзе атрымаў прэстыжную літаратурную прэмію імя Ежы Гедройца, карыстаецца павышанай увагай сярод літаратуразнаўцаў і журналістаў. У. Арлоў, знаёмы большай палове чытачоў як аўтар твораў гістарычнай скіраванасці, у новай кнізе мастацкай прозы выяўляецца як пісьменнік-метафізік. Кнігу складаюць тры аповесці, кожная з якіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прасякнута містыцызмам. Ганна Кісліцына слушна адзначае: «У дадзеным выпадку – містыцызмам як прызнаннем існавання паралельных светаў, якія даволі часта перасякаюцца з нашым» [1].

Першая аповесць, якая і дала назву кнізе, рэалізуе сімвалічны вобраз танцаў над горадам амаль літаральна. Галоўны герой становіцца часткай незвычайнага штоночнага танца самнамбулаў на даху недабудаванага і пакінутага Гатэля. Матыў двухсвецця ў творы ўводзіцца праз стан хваравітага сну – самнамбулізм. Звычайна матыў двайнітва ў мастацкім тэксце ўвасабляецца праз стварэнне паралельнай рэальнасці (залюстрэчча, розных часавых пластоў, анейрасферы і інш.), герояў-двайнікоў ці адначасова і першага, і другога. Ва У. Арлова ж персанажы аповеду самі ўяўляюць з сябе парталы ў іншы свет, яго неад’емныя складнікі. Пры гэтым ірэальную рэчаіснасць персанажаў нельга назваць паўнавартаснай анейрасферай. Гэта своеасаблівая прамежкавая прастора, што знаходзіцца паміж рэальнасцю і сном. Аўтар настолькі дэталёва, псіхалагічна дакладна апісвае пачуцці і паводзіны людзей, якія аказаліся закладнікамі стану хваравітага сну, што міжволі ўзнікае пытанне: а ці не мае аўтар асабіста досведу самнамбулізму? Падобным пытаннем задаецца і Г. Кісліцына: «У галоўным героі чытач з задавальненнем пазнае самога аўтара. Па месцы, дзе адбываюцца падзеі (родны горад пісьменніка). Па шыкоўнай пракурорскай кватэры <…>. Па любові да гісторыі і энцыклапедый. Па пярсцёнку з зялёным каменем. Па любові да плавання, у рэшце рэшт... І ўсё ж, нягледзячы на практычна дакументальную дакладнасць, з якой Арлоў апісвае падзеі, немагчыма не зацікавіцца пытаннем: “Няўжо Арлоў сапраўды самнамбула? Ён рэальна танцаваў на даху? Вось усе гэтыя падзеі – праўда ці містыфікацыя?”» [1]. Падрабязная гісторыя хваробы героя-апавядальніка, пошук ім магчымасці пазбаўлення ад наслання («Але дзень прамінаў за днём, а я па-ранейшаму глытаў нанач блакітную пігулку, прывязваўся да ложка вяровачкай і засынаў з новай кніжкаю фантастыкі» [2, с. 17]), насамрэч больш нагадвае не пакуты, а захапленне незвычайным станам і чаканне працягу: «Хацелася б мне прысніць маё племя» [2, с. 17].

Увядзенне аўтарам матыву самнамбулізму абумоўлівае і вобразную сістэму твора. Персанажы маюць два жыцці адначасова: звычайнае і існаванне начнога самнамбула-танцора (ці танцоркі). Такі від двайніцтва адметны тым, што ў адным фізічным целе суіснуюць дзве асобы. І насуперак распаўсюджанай у такіх мастацкіх тэкстах сітуацыі супрацьстаяння паміж часткамі свядомасці ў аповесці У. Арлова сутыкнення не адбываецца. Больш таго, уладальнікі двух жыццяў нават не падазраюць аб сваім начным існаванні. Выключэннем з’яўляецца толькі герой-апавядальнік, адзіны з усіх членаў таемнага начнога клуба, хто памятае свае прыгоды: «Цяпер ведаю, я не проста належаў да меншасці, якая, абуджаючыся, памятае свае дзеянні, але і сярод меншасці быў анамаліяй, бо выразна бачыў ці, прынамсі, меў перакананне: мне на яве дадзена бачыць усё адбытае» [2, с. 27].

Варта адзначыць, што галоўны герой – юнак, таму ўвядзенне і паказ самнамбулізму як з’явы рамантычнай, хутчэй загадкавай і цікавай, чым небяспечнай, бачыцца апраўданым. Юнацтва – прамежкавая стадыя паміж дзяцінствам з яго светлай верай у дабрыню і маладосцю з яе верагоднымі расчараваннем і стратай даверу да чалавецтва. Менавіта ў юнацтве, сутыкнуўшыся з непрыемнымі і нават жахлівымі праявамі чалавечага жыцця, захоўваецца ці губляецца ўменне захапляцца светам.

Самнамбулізм – хваравіты стан, гэта, па словах самога аўтара, «рэдкае парушэнне сну, калі чалавек, не прачынаючыся, устае з пасцелі, блукае па доме або падымаецца на дах і дэманструе неверагодны спрыт у рухах» [2, с. 16]. Відзежы ў творы з’яўляюцца скажоным уяўленнем лунаціка аб падзеях, якія з ім адбываюцца ноччу. Можна меркаваць, што сон галоўнага героя, звязаны з блуканнем у лабірынце і знаходжаннем выйсця з яго дзякуючы дзяўчыне-лунаціку, – гэта падсвядомы пошук тлумачэння той дзіўнай сітуацыі двух жыццяў, у якую трапіў юнак.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Недаанейрычная рэальнасць, у якой знаходзяцца персанажы твора, стварае ілюзію свабоднага выбару, іншымі словамі, пакідае людзей залежнымі ад невытлумачальных законаў самнамбулізму. Так, герой-апавядальнік спачатку ўпэўнены, што два яго жыцці не судакранаюцца і не могуць уплываць адно на другое, але пасля разумее сваю памылку, адчуваючы страту цікавасці да каханай дзяўчыны.

У другой аповесці «Чорны чалавек на зялёнай канапе», як і ў першай, ярка выяўляецца ўзаемапранікненне паміж рэальным і ірэальным светамі. Калі ў аповесці «Танцы над горадам» гэтая метафізічная з’ява звязвалася са станам хваравітага сну, то ў другім мастацкім тэксце невытлумачальныя падзеі звязаны са станам натхнення і творчага ўзлёту, хоць і тут не абышлося без эратычных сноў са зменай знешняга выгляду персанажа. Сувязь паміж гэтымі творамі больш глыбокая, чым можа падацца на першы погляд. Па сутнасці, другая аповесць уяўляе з сябе аўтарэфлексію, што вытлумачвае, як ствралася першая.

Галоўным героем «Чорнага чалавека на зялёнай канапе» з’яўляецца пісьменнік, які шукае адзіноты дзеля напісання новага літаратурнага твора з незвычайным сюжэтам: людзі рознага ўзросту і полу штоночы збіраюцца на даху будынка, каб распачаць там незвычайны танец, але раніцай толькі адзін чалавек будзе памятаць аб загадкавай прыгодзе. Герой-апавядальнік падчас сваёй творчай працы сутыкаецца з невытлумачальным, з мрояй-галюцынацыяй – у яго імправізаваным кабінеце кожны вечар з’яўляецца Чорны чалавек: «Прысутнасць гэтага *кагосьці* лакалізавалася на зялёнай велюравай канапе. Вольна адкінуўшыся на падушкі і паклаўшы нага на нагу, на канапе сядзеў… абсалютна чорны чалавек» [2, с. 84]. Загадкавы госць ніколі не выходзіў за межы пакоя і паступова стаў часткай свету пісьменніка, абавязковай умовай для напісання чарговых старонак твора аб самнамбулах.

Суседства з госцем з іншасвету пастулова перастала выклікаць у галоўнага героя страх, які змяніўся цікавасцю, прагай разгадаць загадку: для чаго гэтая істота з’явілася ў яго жыцці? Адказ на гэтае пытанне не прымусіў сябе доўга чакаць. Падчас традыцыйнага для героя-апавядальніка заплыву на ўлюбёным возеры перад ім неспадзявана з’явіўся пакой-кабінет сястрынай трохпакаёўкі і Чорны чалавек. «Каб абагнацца ад яго, я даў нырца, але там, пад вадой, чамусьці не паплыў наперад да лілеяў, а рэзка ўзяў убок. Вынырнуўшы, я па-ранейшаму бачыў Чорнага чалавека, які яўна збіраўся выйсці з кабінета. <…> Чорны чалавек стаяў у дзвярах, пакуль мае ногі не намацалі тугі пясок роднага берага» [2, с. 101]. Пасля герой-пісьменнік усвядоміць, што такім чынам штовечаровы незямны госць выратаваў яго ад смерці ў вадзе, якая напаткала іншага персанажа – юнака-студэнта.

Вытлумачваючы вобраз-сімвал Чорнага чалавека, можна палічыць, што У. Арлоў увёў у канву аповесці незвычайны вобраз анёла-ахоўніка. Такое меркаванне выглядала б справядлівым, каб не наступнае разважанне аўтара-апавядальніка: «Ці не быў мой госць анёлам-ахоўнікам? Шчыра кажучы, такі варыянт з некалькіх прычын сур’ёзна не разглядаўся. Нават з увагі на дасціпнае назіранне аднаго калегі, што анёлаў мы, маўляў, пакуль не бачылі, Чорны чалавек меў надта ж некананічнае аблічча. Ублытваць яго ў адну кампанію з нябеснымі сіламі выглядала б учынкам наіўным і неабачлівым» [2, с. 121]. З другога боку, відавочна, што Чорны чалавек становіцца незвычайным сааўтарам аповесці пра самнамбулаў. Магчыма, гэта персаніфікаванае, паўматэрыялізаванае натхненне героя-апавядальніка, які, падобна да першай аповесці, у многім нагадвае самога У. Арлова.

Суіснаванне двух светаў – людзей і міфічных істот – заяўляецца ўжо ў назве апошняй аповесці кнігі У. Арлова. У творы «Дом з дамавікамі» галоўным героем з’яўляецца гісторык Марцін, якому падабаюцца загадкавыя здарэнні і пісьменніцкая работа. Герой адпраўляецца па справах у Швецыю, краіну сямейных легенд, дзе сутыкаецца с невытлумачальнымі з’явамі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Г. Кісліцына ў рэцэнзіі да кнігі слушна адзначае: «Можна без агаворак сказаць, што ў гэтай аповесці У. Арлоў праявіў сябе сапраўдным майстрам саспенса. Саспенс, вядома, слова больш кінематаграфічнае (ад англ. suspense – нявызначанасць, неспакой, трывога чакання, падвешаны стан), але ў дадзеным выпадку яно выдатна апісвае эфект, які стварае тэкст» [1]. Адчуванне нявызначанасці, памежнасці ствараецца праз увядзенне ў тэкст сімвалічнага захаплення галоўным героем красавіком (чаканне ў гэты месяц нечага незвычайнага), дзіўнай сямейнай гісторыі Нільса, паўтарэння гэтай жа гісторыі яшчэ з адной жанчынай, сну-жахалкі галоўнага героя. У адрозненне ад папярэдніх твораў у гэтай гісторыі двухсвецце выяўляецца па-іншаму, бо гісторык нібыта трапляе на мяжу паміж рэальным светам і светам невядомым, напоўненым легендамі і сямейнымі праклёнамі: «Марціна наведала пачуццё лёгкай ірэальнасці таго, што адбываецца» [2, с.180].

Ствараючы такі зменены стан свядомасці героя, аўтар праявіў сябе як майстар нагнятання абстаноўкі: у творы вельмі хутка мяняюцца планы, мяняюцца месцы дзеяння, уводзяцца сапраўдныя тэатральныя дэкарацыі. З развіццём дзеяння дзякуючы частаму з'яўленню адных і тых жа эпізадычных персанажаў і дубляванню блізкіх сюжэтаў (гісторыі кахання) усё больш адчувальным становіцца матыў праследу. Прыкметная роля ў структурнай арганізацыі тэксту належыць анейрычнай рэальнасці – сну-жахалцы, што завяршаецца вымушаным сутыкненнем галоўнага героя з чалавекападобнымі жорсткімі іншапланетнікамі, якіх яшчэ ў дзяцінстве стварыў сам Марцін у сваім нататніку. Кашмарны сон з'яўляецца перасцярогай ці нават прароцтвам, як скончыцца кароткае падарожжа галоўнага героя ў Швецыю. Гісторык у нумары гатэля сутыкаецца з тым загадкавым, што вабіла яго ўсё жыццё: «Якраз тут у дзвярах і спрацаваў электронны замок. Марцін схапіў запалкі з паперай, ды нешта спыніла яго. Дзверы пачалі павольна, вельмі павольна адчыняцца. У іх яшчэ нікога не было, але на прысценак лёг зялёны водсвет. Марцін <…> адкінуўся ў фатэль ды істэрычна засмяяўся» [2, с. 193].

Такім чынам, у кнізе У. Арлова «Танцы над горадам» матыў двайніцтва адыгрывае вялікую ролю. Яго ўзнікненне звязваецца са зменёнымі станамі свядомасці, і найперш – з анейрычнай рэальнасцю, а таксама містыцызмам. Тэкстаўтваральным прынцыпам аповесці «Танцы над горадам» з'яўляецца сітуацыя памежнасці. Гэтаму спрыяе стан хваравітага сну, узрост героя, яго апошні месяц вучобы ў школе (мяжа паміж дзяцінствам і пачаткам дарослага жыцця), незвычайныя танцы на даху недабудаванага Гатэля. Такое месца дзеяння невыпадковае, яно само па сабе можа выступаць сімвалам памежнага стану, пра што сведчаць фіксацыя паміж небам і зямлёй; недабудаванасць, як і юнацтва, сімвалізуе чаканне працягу. У аповесці «Чорны чалавек на зялёнай канапе» матыў двайніцтва рэалізуецца праз увядзенне ў твор візуалізаванага натхнення героя-пісьменніка, якое існуе на мяжы рэальнага і ірэальнага светаў, як і ўсё, што звязана з механізмам творчай дзейнасці. У творы даволі часта сустракаюцца атрыбуты двухсветавасці: люстраныя адбіткі, незвычайныя сны – але ў дадзеным выпадку яны служаць сімваламі памежкавага стану галоўнага героя, які можна звязаць з напружанай творчай дзейнасцю. Выкарыстанне матыву двайніцтва ў творы «Дом з дамавікамі» вылучаецца стварэннем эфекту напружанага чакання магчымасці сутыкнення, узаемапранікнення рэальнага і ірэальнага светаў.

**Літаратура**

1 Кислицына, А. Встреча с призраком и танцы на крыше. Почему стоит почитать новую книгу Владимира Орлова [Электронный ресурс] / А. Кислицына. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/606465.html. – Дата доступа: 05.04.2019 г.

2 Арлоў, Ул. Танцы над горадам: тры аповесці / Ул. Арлоў. – Мінск: Логвінаў, 2017. – 196 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ